| Геаграфічнае адкрыццё | Дата адкрыцця | Імя першаадкрывальніка | Краіна, якая арганізавала экспедыцыю |
|---|---|---|---|
| | | | |

Якія калонкі вы дадалі б у табліцу, каб прадставіць больш поўную інфармацыю пра Вялікія геаграфічныя адкрыцці?

3. Прасачыце па карце маршруты вядомых падарожнікаў. Якое з Вялікіх геаграфічных адкрыццяў вы лічыце найбольш важным? Растлумачце свой пункт гледжання.
4. Знайдзіце на картасхеме 1-га форзаца тэрыторыі дзяржаў ацтэкаў і інкаў. Як вы думаеце, чаму заваяванне Амерыкі пачалося менавіта з гэтых тэрыторый?
5. Ахарактарызуйце станоўчыя і адмоўныя наступствы Вялікіх геаграфічных адкрыццяў.
6. Падрыхтуйце невялікія паведамленні пра выдатных мараплаўцаў. Асаблівую ўвагу надайце якасцям асобы, якімі павінен быў валодаць падарожнік, што выпраўляўся ў невядомыя моры і краіны.

## § 3. Усталяванне новых ідэй у эпоху Адраджэння

**Успомніце.** *Што такое гуманізм? Чаму новая культура Позняга сярэднявечча атрымала назву Ранняга Адраджэння, а яе дзеячы называліся гуманістамі?*

У XVI — пачатку XVII ст. у Еўропе распаўсюдзілася культура Позняга Адраджэння. Гэта быў перыяд велізарнага духоўнага ўздыму, росквіту гуманізму, хуткага росту гарадоў, развіцця навукі і тэхнікі.

**Вы даведаецеся.** *Якія новыя ідэі былі прапанаваны гуманістамі ў XVI ст. Якім яны хацелі бачыць чалавечае грамадства. Чаму некаторых з іх мы называем вялікімі летуценнікамі.*

**1. Гуманістычныя каштоўнасці эпохі Адраджэння.** Як вы ўжо ведаеце, у эпоху Ранняга Адраджэння ў Еўропе з'явілася адмысловая група аду-

каваных людзей, якія называлі сябе гуманістамі. Яны сталі стваральнікамі новай культуры. Гуманісты былі перакананыя, што чалавек заслугоўвае шчасця ў зямным, а не замагільным жыцці, і абвясцілі права на свабоду, справядлівасць і лепшы грамадскі парадак.

Дзеячы культуры Адраджэння верылі ў бязмежныя магчымасці чалавека, яго розуму і волі. Яны выступалі супраць прагі назапашвання багацця, прыгнёту асобы, асуджалі заваёўнікаў. Так, знакаміты мастак Леанарда да Вінчы пісаў з абурэннем мараплаўцу Амерыга Веспучы: «Ты выпраўляешся на паляванне на іншыя астравы, захопліваеш у палон іншых людзей».

*Як вы думаеце, чаму многія гуманісты асуджалі іспанскіх канкістадораў?*

Гуманісты цікавіліся культурай Старажытнай Грэцыі і Старажытнага Рыма. Яны шукалі творы забытых аўтараў. Дзякуючы іх карпатлівай працы старажытныя шэдэўры рабіліся здабыткам грамадства. Гуманісты нібы адраджалі даўно забытую Еўропай антычную культуру з яе любоўю да зямнога жыцця, зямных радасцей і зямной прыгажосці. Адсюль і паходзіць назва цэлай эпохі ў еўрапейскай гісторыі — ***Адраджэнне***, або ***Рэнесанс*** (ад лац. *renasci* — нараджацца зноў, адраджацца).

У сваіх творах гуманісты ўзвышалі чалавека, праслаўлялі прыгажосць яго і навакольнага свету. Яны набліжалі мастацтва да народа. Асоба, а не Бог, паступова рабілася цэнтрам Сусвету, гаспадаром жыцця, стваральнікам усіх яго каштоўнасцей.

**2. Мары гуманістаў аб усеагульным шчасці.** Сярод гуманістаў вылучалася асаблівая катэгорыя людзей. Яны выступалі супраць тыраніі феадальных сеньёраў, марылі аб свабодным чалавеку ў вольным грамадстве без сацыяльнай несправядлівасці, прыгнёту і галечы. Такіх людзей і цяпер называюць вялікімі летуценнікамі.

Адным з іх быў Томас Мор (1478—1535), пісьменнік-гуманіст, які пэўны час займаў пасаду лорд-канцлера Англіі. Ён быў пакараны па загадзе Генрыха VIII за тое, што выступіў супраць неабмежаванай улады караля над царквой. Але засталася яго кніга «Утопія», напісаная у 1516 г. У перакладзе з грэчаскай мовы гэта назва азначае «месца, якога няма». Томас Мор апісаў гуманнае грамадства, у якім перамагае

34—35



37—39

Востраў Утопія. Ілюстрацыя да кнігі Томаса Мора «Утопія». 1516 г.

справядлівасць. У ім няма багатых і бедных, усе грамадзяне роўныя. Людзі працуюць па шэсць гадзін у дзень, а ўсё неабходнае атрымліваюць бясплатна. Вольны час члены гэтага грамадства аддаюць заняткам навукай, мастацтвам і фізічнай культурай.

Томас Мор выступаў супраць гвалту і войнаў. Яму хацелася, каб на зямлі ўсталяваліся мір і дабрабыт, а людзі жылі так, як грамадзяне яго «Утопіі».

З недасканаласцю чалавечага грамадства змагаўся ў сваіх творах вучоны-гуманіст Эразм Ратэрдамскі (1469—1536). Сучаснае жыццё ўяўлялася яму кірмашом дурняў. У знакамітай кнізе «Пахвала дурасці» (выдадзена ў 1511 г.) ён выказаў надзею на з'яўленне гарманічнага і справядлівага чалавека. Вучоны марыў аб ідэальным грамадстве, якое назваў у гонар свайго сябра Томаса Мора — Морыяй, гэта значыць фантазіяй, або марай.



Томас Мор



Эразм Ратэрдамскі



Тамаза Кампанела

*Разгледзьце партрэты вядомых гуманістаў і вызначце, да якіх пластоў грамадства адносяцца гэтыя людзі. Якія з гэтага можна зрабіць высновы?*

Грамадства, дзе ўсе працуюць дзеля агульнага дабра, апісаў ва ўтапічным рамане «Горад Сонца» італьянскі мысляр і пісьменнік Тамаза Кампанела (1568—1639). Горад Сонца — гэта шчаслівая краіна, схаваная ў водах Індыйскага акіяна. Тут пануе поўная гармонія, няма прыватнай уласнасці, людзі працуюць разам і пароўну размяркоўваюць усё, што вырабляюць. Яны трымаюцца прадпісанняў адзінай кнігі, назва якой — «Мудрасць».

**3. Літаратура Рэнесансу.** Найбольш ярка рысы і дух Рэнесансу адлюстравалі ў сваіх творах Сервантэс і Шэкспір.

Творчасць іспанскага пісьменніка эпохі Адраджэння ***Мігеля дэ Сервантэса*** (1547—1616) аказала вялікі ўплыў на сусветную культуру. Будучы пісьменнік нарадзіўся ў небагатай сям'і, але атрымаў добрую адукацыю. Беднасць прымусіла юнака шукаць шчасця за мяжой. Жыццёвы досвед і талент дазволілі Сервантэсу стаць пісьменнікам.



Мігель дэ Сервантэс Сааведра. Мастак *Хуан дэ Хаурэгі.* 1600 г.

У сваім творы — рамане «Хітры гідальга Дон Кіхот Ламанчскі» — Сервантэс высмеяў сярэднявечны ідэал рыцарства.

Галоўны герой рамана — гідальга (іспанскі дваранін) Дон Кіхот. Ён надзелены вялікім розумам, валодае шырокімі ведамі, ён — шчыры прыхільнік гуманістычных каштоўнасцей. У людзях гідальга шануе асабістыя заслугі і вартасці, а не тытулы і радавод, як было прынята ў Сярэднія вякі. Пры гэтым Дон Кіхот лічыць, што ён усё яшчэ жыве ў часы рыцарства і ўдзельнічае ў небяспечных і захапляльных прыгодах. Яго слуга Санча Панса беспаспяхова спрабуе пераканаць гаспадара ў тым, што «замкі», якія той бачыць, усяго толькі заезныя дамы, а «варожыя рыцары» — ветракі. Дон Кіхот не здольны зразумець новы свет простых і практычных людзей тыпу Санча Панса. Нягледзячы на высакародныя памкненні, пахвальнае жаданне змяніць нешта да лепшага, ён увесь час трапляе ў недарэчныя і смешныя гісторыі.

*Як вы думаеце, донкіхоцтва — гэта станоўчая ці адмоўная з'ява? Сваё меркаванне патлумачце.*

У выніку імя Дон Кіхота стала намінальным. І ў наш час адарваных

ад жыцця летуценнікаў і фантазёраў называюць донкіхотамі, а іх дзеянні — донкіхоцтвам.

49—50 Адзін з лепшых англійскіх пісьменнікаў ***Уільям Шэкспір*** (1564—1616) нарадзіўся ў сям'і заможнага гараджаніна. Усё яго жыццё было звязана з тэатрам «Глобус» у Лондане, папулярным сярод не толькі багатых, але і бедных людзей. Менавіта тут была пастаўлена большасць п'ес Шэкспіра.

Яго творы прасякнуты глыбокай цікавасцю да чалавека, да невырашальных супярэчнасцей чалавечага жыцця. У гістарычных драмах, камедыях і трагедыях Шэкспір даследаваў такія «вечныя» тэмы, як любоў і рэўнасць, славалюбства і сквапнасць.

Ён пераконваў чытача і гледача ў тым, што сапраўднай рухальнай сілай падзей з'яўляецца не Божая воля, а асоба, якая можа змяніць нават ход гісторыі. Шэкспір папярэджваў: чалавек, які страціў маральныя якасці, можа ператварыцца ў разбуральную сілу.

На схіле жыцця пісьменнік і мысляр стварыў свае самыя дасканалыя творы: трагедыі «Гамлет», «Атэла», «Рамэа і Джульета», «Кароль Лір» і інш. Да нашага часу яго п'есы з нязменным поспехам ідуць у многіх тэатрах свету, у тым ліку і на беларускай сцэне.

*Такім чынам, гуманісты эпохі Адраджэння ўнеслі вялікі ўклад у станаўленне сучасных уяўленняў аб праве чалавека на свабоду, справядлівасць і шчасце.*




Партрэт Уільяма Шэкспіра, вядомы па гравюры Марціна Друшаўта. Партрэт быў размешчаны на тытульным лісце Першага Фоліа — зборніка п'ес Шэкспіра, апублікаванага ў 1623 г. Гэта адзін з двух партрэтаў, якія можна з упэўненасцю ідэнтыфікаваць як выяву Шэкспіра

*Даведайцеся, якая другая вядомая выява Шэкспіра.*

***Ключавыя словы:*** *Адраджэнне (Рэнесанс), гуманісты, утопія, Томас Мор, Эразм Ратэрдамскі, Тамаза Кампанела, Мігель дэ Сервантэс, Уільям Шэкспір.*

**Пытанні і заданні**

**1.** Пералічыце гуманістычныя каштоўнасці эпохі Адраджэння.
**2.** Як вы думаеце, чаму гуманістаў цікавіла антычная культура?
**3.** Запоўніце ў сшытку табліцу «Выбітныя гуманісты».

| Імя пісьменніка-гуманіста | Назва твора | Асноўныя гуманістычныя ідэі |
|---|---|---|
| | | |

**4.** Знайдзіце ў тэксце параграфа інфармацыю, якая пацвярджае, што Сервантэс і Шэкспір — пісьменнікі-гуманісты.
**5.** Падрыхтуйце і прадстаўце аднакласнікам выступленне ад асобы аднаго з гуманістаў, названых у параграфе, на тэму: «Якім павінна быць чалавечае грамадства».

## § 4. Мастацтва эпохі Адраджэння

**Успомніце.** *У якой краіне і калі зарадзілася культура Адраджэння? Каго з прадстаўнікоў Ранняга Адраджэння вы можаце назваць?*

Асаблівае месца ў гісторыі еўрапейскай культуры займае мастацтва эпохі Адраджэння. Пад уплывам гуманістычных ідэй нечуванага росквіту дасягнулі жывапіс, скульптура і архітэктура. У творчасці жывапісцаў Рэнесансу адлюстравалася характэрная для гуманізму цікавасць да чалавека, яго пачуццяў і думак.

**Вы даведаецеся.** *Якія тэмы раскрывалі жывапісцы эпохі Адраджэння. Чым праславіліся італьянскія мастакі Леанарда да Вінчы, Мікеланджэла і Рафаэль.*

**1. Прадстаўнікі італьянскага Адраджэння.** Італьянскае Адраджэнне падарыла свету трох найвялікшых мастакоў: Леанарда да Вінчы, Мікеланджэла і Рафаэля.